# Скарб з Лонданскай бібліятэкі

Хто не трымаў у руках буквар! Дзякуючы яму мы атрымліваем чароўны ключык да велізарных скарбаў, назапашаных продкамі, сучаснікамі пры дапамозе… літараў. Аднак каму першаму прыйшла ў галаву на славянскіх землях сама назва? У супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі ўпершыню з’явілася магчымасць прадставіць публіцы якасныя выявы кнігі — першай у гісторыі! — пад назваю “Буквар”. Прычым аказалася ім якраз беларускае выданне, якому праз два гады споўніцца 400 гадоў.



Гэта, можна сказаць, культурнае адкрыццё. А ўдалося зрабіць яго дзякуючы візіту ў Лондан у канцы 2015 года Алеся Сушы, старшыні Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Спецыялісты ведаюць: у свеце захаваліся толькі два асобнікі гэтага ўнікальнага выдання. Адзін з іх, няпоўны, знаходзіцца ў Даніі, у Каралеўскай бібліятэцы. А другі (поўны) экзэмпляр — у Вялікабрытаніі, у Бібліятэцы Мідл Тэмпл — гэта ў гістарычным раёне Лондана Тэмпл, дзе некалі мелі сваю рэзідэнцыю знакамітыя рыцары-тампліеры.

Алесь Суша сцвярджае: ніводзін з беларускіх даследчыкаў, ва ўсялякім разе з тых, хто жыве сёння, раней не меў магчымасці ўбачыць схаваны ў Лондане “Буквар” на свае вочы. На радзіме ж выдання ніводнага асобніка не захавалася: іх, пэўна, проста “зачыталі да дзірак”, як тое бывае з вучэбнымі выданнямі, ці яны пагінулі ў шматлікіх войнах-пажарах-перагрусах. Аднак беларусам вельмі пашанцавала, што адна з тых кніг на пачатку XVII стагоддзя была вывезена ў Лондан калекцыянерам вучэбных выданняў Робертам Эшлі. У далейшым яна трапіла ў закрыты для знешняга свету збор лонданскіх барыстэраў (карпарацыю адвакатаў), дзе захоўваецца і па сёння.

“Дзякуючы спрыянню брытанскіх беларусістаў, прафесараў Лонданскага універсітэта, і перш за ўсё Джыма Дынглі, у мяне з’явілася магчымасць вывучыць каштоўны помнік нашай культуры і нават зрабіць некаторыя копіі”, — паведаміў журналістам Алесь Суша. Беларускаму даследчыку ўдалося яшчэ ўдакладніць, што першая ў свеце кніга пад назваю “Буквар” была выдадзена 24 ліпеня 1618 года ў друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага брацтва ў Еўі (цяпер гэта — паселішча ва ўсходняй Літве, за 14 км ад Электрэнай). Гэта было адно з самых старадаўніх і ўплывовых беларускіх выдавецтваў у Вялікім Княстве Літоўскім.